мадства. Мэтай экалагічнай адукацыі і выхавання з'яўляецца фарміраванне сістэмы навуковых ведаў, поглядаў і перакананняў асобы. Паказчыкі экалагічнай выхаванасці — практычныя дзеянні чалавека ў адносінах да прыроднага асяроддзя, свайго здароўя і здароўя будучых пакаленняў.

**Грынчык М.М.**, *прафесар*

# ВЫВУЧЭННЕ ГУМАНІСТЫЧНЫХ ВЫТОКАЎ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЯК АСНОЎНЫ НАКІРУНАК КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

Пачынаючы з глыбокай старажытнасці, гуманізм (г.зн. любоў і павага да чалавека, а шырэй — духоўная еднасць, калектыўная салідарнасць людзей, аб'яднаных знешнімі ўмовамі чалавечага суіснавання) з'яўляўся зыходнай маральнай асновай далейшага развіцця і прагрэсу чалавецтва. Вядома, што асноўныя прынцыпы гуманізму як філасофскай канцэпцыі былі сфармуляваны ў часы антычнасці, але сваёй глыбокай дэмакратычнай сутнасцю былі скіраваны супраць афіцыйнай ідэалогіі, якая ў сваёй дзяржаўнай палітыцы больш схілялася да воўчых законаў прымусу і варожасці (нагадаем трагічны лёс славутага Сакрата).

У эпоху зараджэння хрысціянства і яго імклівага распаўсюджання ў Еўропе стыхійны першабытны гуманізм арганічна ўваходзіць у аснову хрысціянскай маралі, становіцца зыходнай асновай духоўнага выхавання чалавека, фарміравання яго грамадскіх поглядаў, творчай дзейнасці і культуры ў самым шырокім сэнсе гэтага паняцця. Паступова фарміруецца даволі трывалая і паслядоўная тэорыя класавай салідарнасці ў аснове



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

якой — эвалюцыйны шлях сацыяльнага і культуралагічнага прагрэсу.

Гуманізм у сферы мастацкай творчасці — не толькі сацыяльна-філасофская катэгорыя, але і глыбінны імпульс ідэйна-эстэтычных пошукаў і абагульненняў. Яшчэ з часоў Ф.Скарыны і М.Гусоўскага ён становіцца асноўным зместам іх шматграннай культурна-асветніцкай і літаратурнай дзейнасці, зыходным прынцыпам канцэпцыі адраджэння. У яе аснове — хрысціянская этыка і мараль, імкненне палепшыць жыццё грамадства шляхам гуманітарызацыі саслоўных адносін і ўсеагульнай асветы «люду паспалітага».

Прынцыпы гэтыя выразна супрацьстаялі тагачасным радыкальным тэндэнцыям, якія найбольш адкрыта выявіліся ў сялянскіх бунтах у Паўднёвай Германіі на чале з Т.Мюнцарам. Трагічны фінал гэтых падзей, відаць, быў улічаны беларускімі асветнікамі-гуманістамі.

Гуманістычныя традыцыі беларускіх асветнікаў аказаліся выключна трывалымі і ў пазнейшыя гады. Нягледзячы на відавочны спад гуманістычных ідэй у гады Рэфармацыі і Контррэфармацыі, затым у перыяд дзейнасці С.Полацкага, які адкрыта становіцца на аўтарытарныя пазіцыі, ідэі гуманізму ўсё больш арганічна ўваходзяць у аснову фальклорнай творчасці. Яны адпаведна пераасэнсоўваюцца, трансфармуюцца, паступова рыхтуючы перадумовы новага ўзлёту ў эпоху рамантызму.

Уплыў народных гуманістычных традыцый, арганічны сінтэз у іх этыкі і эстэтыкі найбольш яскрава выявіўся тут у ідэі маральнай рэабілітацыі прыгоннага сялянства як найбольш прыгнечанай і занядбанай часткі феадальнай супольнасці (Я.Чачот, В.Дунін-Марцінкевіч, Ф.Савіч і інш.). Наватарскі характар творчасці пачынальнікаў беларускай літаратуры вызначаецца імкненнем узвысіць вясковага жыхара-працаўніка і паэта, яго звычаі і абрады, сапраўдную вышыню інтэлекту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адмаўленне чалавечых правоў селяніна — гэта парушэнне элементарных маральных асноў чалавечага суіснавання, грамадскай салідарнасці, а шырэй — маральнага кодэксу чалавечай цывілізацыі. І ў гэтых адносінах маладая беларуская літаратура, афіцыйна непрызнаная і забароненая, шмат у чым апярэджвала многія больш развітыя еўрапейскія літаратуры.

Зусім натуральна, што пасля паўстання 1863г. у творчасці Ф.Багушэвіча, Я.Лучыны і іншых ідэя рэабілітацыі беларускага сялянства набывае новыя маштабы і змест. Яна перарастае чыста гуманітарныя абсягі і паступова набывае выразную патрыятычную накіраванасць: гуманізм адносін, сапраўдная павага да чалавека, развіццё лепшых ментальных рыс характару магчымы толькі ва ўмовах палітычнай незалежнасці і свабоды. Таму ўся творчасць «бацькі беларускага Адраджэння» Ф.Багушэвіча непарыўна звязана з нацыянальнай ідэяй, раскрыццём высокіх гуманістычных вартасцей нацыянальнага характару беларуса, пошукамі адпаведных гістарычных рэалій і паралеляў, абаронай роднай мовы, культуры, пачуцця нацыянальнага гонару, грамадзянскай свядомасці, асабістай адказнасцю кожнага перад наступнымі пакаленнямі. Такім чынам, у спадчыне Ф.Багушэвіча, яго сучаснікаў і паслядоўнікаў закладзены асновы новай творчай канцэпцыі беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя.

Бясспрэчна, у яе фарміраванні разам з нацыянальнымі традыцыямі (фальклору, хрысціянства, літаратуры) істотную ролю адыгралі гуманістычныя традыцыі сусветнай літаратуры, пачынаючы з класічнай спадчыны італьянскіх гуманістаў і канчаючы вяршыннымі здабыткамі блізкароднасных славянскіх літаратур (Т.Шаўчэнка, А.Пушкін, А.Міцкевіч, М.Лермантаў). Як тут не нагадаць запавет славутага Дж.Петраркі: «Вызратаванне чалавецтваў культуры» (маецца на ўвазе духоўная культура і яе аснова — гуманізм).

Свайго апагея канцэпцыя гуманізму дасягае ў творчасці беларускіх паэтаў-адраджэнцаў пачатку ХХ стагоддзя. Новыя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычныя абставіны, уздым нацыянальна-вызваленчага руху, палітычная актывізацыя сялянскіх мас і нацыянальнай інтэлігенцыі, паскоранае развіццё многіх сфер духоўнай культуры — усё гэта стымулявала пошукі нашых класікаў Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, набываючы новыя, выключна адметныя самабытныя рысы. Так, працягваючы традыцыі Ф.Багушэвіча, Я.Купала прыдае ім новую патрыятычную, сацыяльна накіраваную, агульнасацыяльную маштабнасць, шырокі гістарычны кантэкст. Сваю нацыянальную «крыўду» беларусы выносяць на справядлівы суд усіх цывілізаваных народаў («На свет цэлы»), а заключны дэвіз верша («А хто там ідзе?»): «Людзьмі звацца»,— увасабляе ўсе асноўныя крытэрыі свабоднага развіцця чалавека.

У творчасці Я.Коласа гэтая ідэя свабоды і незалежнасці матывуецца шляхам паэтызацыі народнага жыцця, сялянскай працы, побыту, узвышэння маральных вартасцей народа, яго перавагі над тагачаснымі «гаспадарамі жыцця». Своеасаблівым сімвалам гэтай свабоды і незалежнасці выступае зямля як крыніца дабрабыту і радасці, надзейны заслон ад усіх нечаканасцей зменлівага лёсу:

Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,
Каб з панскіх выпутацца пут,
І там зажыць сабе нанова:
Свая зямля — вось што аснова.

Сінанімічны вобраз «сваёй зямлі», зямлі-карміцелькі, зямлі-талісмана, па свайму генетычнаму паходжанню непарыўна звязаны з галерэяй тых архетыпаў фальклорнай паэтыкі, што сімвалізуюць глыбокі гуманістычны змест земляробчай працы: у ім выяўлены цэлы комплекс маральна-этычных рыс селяніна-працаўніка, яго сумленнасць і альтруізм, высакароднае імкненне служыць іншым. Разам з тым «свая зямля» выступае тут як сімвал асабістай незалежнасці чалавека, адданасці роднай зямлі, людзям.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У гэтым глыбінным раскрыцці народнай самасвядомасці, яе гуманістычнай (г.зн. агульначалавечай) сутнасці велізарная заслуга Я.Коласа і яго сучаснікаў і аднадумцаў, якія ўнеслі неацэнны ўклад у скарбніцу сусветнай духоўнай культуры.

Праблема гуманізму набывае ў наш час прынцыповае навукова-тэарэтычнае значэнне; яна садзейнічае паглыбленаму раскрыццю сапраўдных эстэтычных вартасцей мастацкай творчасці, яе ролі ў гістарычным развіцці кожнага народа як неад'емнай часткі чалавечай супольнасці.

Не менш істотны і метадалагічны аспект праблемы гуманізму ў мастацкай творчасці. Ён павінен улічвацца пры абнаўленні і дапрацоўцы вучэбных планаў і праграм, пры вызначэнні асноўнай праблематыкі спецкурсаў і спецсемінара, вузлавых пытанняў курса ўводзін у літаратуразнаўства, тэорыі літаратуры, у працэсе планавання курсавых і дыпломных работ і іншых формаў універсітэцкай падрыхтоўкі спецыяліста-філолага.

Гуманізм творчых пазіцый пісьменніка, яго эстэтычная канцэпцыя павінны стаць асноўным крытэрыем вартасці мастацкага твора, дамінантнай рысай яго нацыянальнага і агульначалавечага значэння. Адсюль зусім новыя прынцыпы адбору літаратурнага матэрыялу ў падручніках і хрэстаматыях для школы і ВНУ, новыя метадалагічныя падыходы і ацэнкі. У іх аснове -- ўзвышэнне асобы чалавека, свабоднага ад чыста бытавых праблем і скіраванага ў больш шырокія перспектывы духоўнага пазнання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ